**А. М. МАКАРЭВІЧ**,
доктар філалагічных навук, загадчык кафедры беларускай літаратуры
Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова

# АСАБЛІВАСЦІ ВЫВУЧЭННЯ АРТЫКУЛА ЦЁТКІ «ШАНУЙЦЕ РОДНАЕ СЛОВА» ў VII класе

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Выхаванне ў вучняў павагі да беларускага слова, нацыянальнай культуры і літаратуры — надзённая задача на сучасным этапе атрымання сярэдняй адукацыі. Актуальнасць яе відавочная сёння таму, што беларуская мова — адна з дзяржаўных (побач з рускай) — шырока не запатрабавана ў грамадстве. У такіх умовах вельмі важным з'яўляецца зварот на ўроках у школе да прыкладаў годнага стаўлення да нацыянальных культурных здабыткаў і беларускай мовы лепшых прадстаўнікоў нацыі ў розныя перыяды. У сувязі з гэтым настаўнік мае магчымасць выкарыстаць выхаваўчы патэнцыял артыкула Цёткі (Алаізы Пашкевіч) «Шануйце роднае слова», які вывучаецца ў VII класе.

Вашай увазе прапануецца тэарэтычны матэрыял для падрыхтоўкі ўрокаў па азначанай тэме. Ён дапаўняе адпаведны раздзел у вучэбным дапаможніку [3, с. 221—222] і закліканы дапамагчы настаўніку даць першапачатковае ўяўленне сямікласнікам пра публіцыстыку як від літаратуры. У адаптаваным, больш спрошчаным выглядзе гэты тэарэтычны матэрыял можна прапанаваць вучням у залежнасці ад узроўню іх падрыхтаванасці.

Артыкул Цёткі «Шануйце роднае слова» прапаноўваецца для вывучэння ў кантэксце раздзела «Мастацкая літаратура і навука» [2, с. 42]. Да гэтага часу школьнікі ў курсе беларускай літаратуры не звярталіся да паняцця «публіцыстыка». Вучэбная праграма якраз і арыентуе настаўніка разгледзець на тэарэтычным узроўні наступныя пытанні: «публіцыстыка як від літаратуры», «адрозненне мастацкага адлюстравання жыцця ад навуковага» [2, с. 43]. Праблема асэнсавання і адлюстравання грамадскіх з'яў у публіцыстыцы ў далейшым у школьным курсе літаратуры будзе вывучацца ў IX класе: характарыстыка палемічнай літаратуры (XVII ст.) як жанру публіцыстыкі, паглыбленне паняцця пра публіцыстыку як від літаратуры (на прыкладзе вывучэння «Мужыцкай праўды» К. Каліноўскага). Таму вельмі важным з'яўляецца першы этап звароту да публіцыстыкі ў VII класе: ён дае ўяўленне пра гэты від літаратуры.

У той жа час праца з такім вучэбным матэрыялам на гэтым этапе вымагае ад настаўніка спецыфічнай (гісторыка-тэарэтычнай і метадычнай) падрыхтоўкі, бо, акрамя разгляду цяжкіх для вучняў пытанняў тэарэтычнага зместу, неабходна звяртаць асаблівую ўвагу на выхаваўчы патэнцыял артыкула «Шануйце роднае слова» і планаваць адпаведныя формы працы з ім.

Пры планаванні і падрыхтоўцы да ўрокаў настаўнік найперш мусіць кіравацца «Вучэбнай праграмай...» і «Прыкладным каляндарна-тэматычным планаваннем па вучэбным прадмеце "Беларуская літаратура"...» (далей — «Прыкладнае планаванне») для адпаведнага навучальнага года. Акрамя гэтага, пры падрыхтоўцы да ўрокаў па гэтай тэме настаўнік можа выкарыстаць

матэрыял вучэбнага дапаможніка «Беларуская дзіцячая літаратура», у якім характарызуецца асветніцкая дзейнасць Цёткі і яе артыкул «Шануйце роднае слова» [1, с. 105—132].

Паколькі «Прыкладнае планаванне» вызначае асноўныя мэты і задачы працы з гэтым артыкулам, то далей звернемся да характарыстыкі формаў працы з ім у кантэксце двух урокаў.

## Першы ўрок

**I.** Тлумачэнне настаўнікам новага матэрыялу: роля публіцыстыкі ў жыцці грамадства, публіцыстыка як від літаратуры, яе жанры («віды твораў»), мэта публіцыстычных твораў, сувязь публіцыстыкі з грамадазнаўствам, гісторыяй. Падмуркам для такога тлумачэння будзе найперш матэрыял з вучэбнага дапаможніка для VII класа. Акрамя гэтага, настаўнік можа падмацаваць свае тэарэтычныя выкладкі характарыстыкай публіцыстычнага тэксту Каруся Каганца «Парада».

У XIX — пачатку XX ст. вялікае значэнне дзеля абуджэння нацыянальнай свядомасці беларусаў мелі звароты да іх «званароў адраджэння» (С. Палуян). «Прамова» (1893) і «Парада» (1905) Каруся Каганца вельмі гарманічна ўпісваюцца ў тую частку беларускай літаратуры, якая мела заклікальны пафас адраджэнскага зместу. Карусь Каганец — з шэрагу тых пісьменнікаў-нашаніўцаў, якія імкнуліся з дапамогай друкаваных літаратурных твораў паказаць простаму люду, што яго мова і яго лад жыцця заслугоўваюць увагі самага высокага мастацтва. Вырашэнне такой задачы садзейнічала ўзнікненню цікавасці да свайго роднага, беларускага, народных традыцый і ладу жыцця, а як вынік — спрыяла станаўленню і развіццю нацыянальнай свядомасці беларусаў.

«Парада» Каруся Каганца паводле зместу, стылю, формаўтваральных паказчыкаў знаходзіцца на мяжы публіцыстыкі і мастацкай літаратуры.

Палемічнасць, эмацыянальнасць, інтанацыі палітычнай прамовы, праблемы грамадскага жыцця, асэнсаванне якіх служыць нагодай для адпаведнага сацыяльнага абвінавачвання, прысуду і заклiку, — усё гэта набліжае дадзены тэкст да публіцыстыкі. Мэта прамовы — актыўна ўздзейнічаць на сучаснікаў, на іх грамадзянскія погляды, каб змяніць іх і накіраваць на вырашэнне нацыянальных праблем: узнікнення, замацавання і сталення нацыянальнай самасвядомасці. Прадмет адлюстравання тут — супярэчлівыя праявы грамадскага, нацыянальнага жыцця, якія выступаюць як аргументы, доказы, як нагода дзеля вынясення сацыяльнага абвінавачвання, прысуду і заклiку.

У «Парадзе» прадстаўлены вобраз прамоўцы, які з'яўляецца носьбітам народнай мудрасці. Ён «ад шчырага сэрца» прамаўляе свой зварот да суайчыннікаў. Гэты вобраз надзелены неспакойным характарам, грамадзянскай катэгарычнасцю мыслення і, адпаведна, высноў. Прамоўца жыве ў час агучвання яго парады. А гэта ўжо прыкметы мастацкасці ў літаратурным тэксце.

**II.** Далей мэтазгодна звярнуцца да кароткай характарыстыкі часу, грамадскіх умоў, у кантэксце якіх разгортвалася асветніцкая дзейнасць Цёткі. Варта звярнуць увагу на ролю часопіса «Лучынка» і працу ў ім пісьменніцы, публікацыю на старонках гэтага выдання яе артыкулаў асветніцкага зместу. Матэрыял для такой характарыстыкі можна знайсці ў вучэбным дапаможніку «Беларуская дзіцячая літаратура». Змест артыкулаў Цёткі, якія разглядаюцца ў названым дапаможніку, можа быць тэарэтычным падмуркам для настаўніка пры падрыхтоўцы яго да характарыстыкі тэарэтычнага матэрыялу «На сумежжы з навукай» з вучэбнага дапаможніка для VII класа.

**III.** Чытанне настаўнікам артыкула «Шануйце роднае слова» з вылучэннем тых частак у ім, дзе прысутнічаюць эмацыянальныя звароты, заклікі пісьменніцы (яны будуць аналізавацца на наступным уроку, аднак на іх неабходна звярнуць увагу, каб паступова падводзіць вучняў да гутаркі па тэорыі літаратуры: адрозненне мастацкага, мастацка-публіцыстычнага адлюстравання жыцця ад навуковага).

**IV.** Аналіз зместу артыкула і яго ідэі (асноўная форма працы — тлумачэнне настаўніка).

**1.** Вызначэнне *галоўнай праблемы*:

- вызначэнне сутнасці паняцця «праблема мастацкага твора» (акрэсліванне надзённых пытанняў, якія патрабуюць вырашэння, — ідэалагічных, грамадскіх, маральных, псіхалагічных — важных для раскрыцця сэнсу твора);
- вызначэнне тыпу галоўнай праблемы (грамадская);
- яе фармулёўка (праблема звароту да роднай мовы на паўсядзённым узроўні).

**2.** Характарыстыка *патрыятычнага пафасу і грамадскай надзённасці* артыкула (ён вынікае з галоўнай праблемы, якая адлюстроўваецца і асэнсоўваецца ў артыкуле):

- вызначэнне вучнямі пры дапамозе настаўніка тых частак артыкула, у якіх найбольш выразна акрэслены праблемы (дапаможа гэтаму матэрыял другога ўрока па гэтай тэме, пададзены ніжэй);
- характарыстыка пафасу артыкула (*Пафас — асаблівасці твора, якія здольныя нараджаць у душы чытача такія пачуцці, што ў сваю чаргу натхняюць яго на здзяйсненне адпаведных учынкаў. Пафас у дадзеным выпадку*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

*выяўляецца найперш у закліках, але значную ролю выконваюць пры гэтым таксама і адпаведныя ілюстрацыі да высноў пісьменніцы. Пафас гэтага артыкула ў наступным: у яго патрыятычнасці — заклік да захавання роднай мовы ў паўсядзённым ужытку, а гэта ў сваю чаргу будзе спрыяць таму, што беларусы «пойдуць цвёрдай ступой да лепшай будучыні, да ясных зор шчасця народнага» [3, с. 225]. Пры гэтым варта падкрэсліць, што пафас артыкула ў такой яго фармулёўцы асабліва надзённым быў для пачатку XX ст., калі востра стаяла праблема адраджэння беларускай культуры, мовы. Але і сёння, нягледзячы на значнасць нацыянальных культурных здабыткаў, гэты пафас застаецца ўсё яшчэ актуальным)*;

- характарыстыка надзённасці зместу артыкула для сучаснасці. *(У артыкуле ўтрымліваюцца не толькі заклікі да актыўнай дзейнасці ў падтрымку роднай мовы. Яго змест спрыяе абуджэнню жадання карыстацца беларускай мовай у штодзённым жыцці, захапленню ідэяй пашырэння сферы карыстання ёю. Усё гэта садзейнічае выхаванню ў беларусаў пачуцця нацыянальнай самадастатковасці, г. зн. упэўненага адчування сябе ў розных грамадскіх абставінах як прадстаўніка нацыі з вялікімі гістарычнымі здабыткамі. У сваю чаргу такое выхаванне, адчуванне і імкненне могуць прывесці да таго, што, як вызначыў у пачатку XX ст. Вацлаў Ластоўскі, «беларус захоча застацца беларусам»)*

**V.** Падагульненне і высновы па ўроку.

**VI.** Дамашняе заданне: 1) прачытаць артыкулы «На сумежжы з навукай», «Шануйце роднае слова»; 2) падрыхтаваць адказы на пытанні да гэтых артыкулаў.

## Другі ўрок

**І.** Праверка дамашняга задання (форма: франтальная гутарка ў адпаведнасці з пытаннямі да артыкулаў «На сумежжы з навукай», «Шануйце роднае слова»).

**II.** Складанне тэзісаў на матэрыяле артыкула «Шануйце роднае слова». Форма працы: чытанне артыкула ў адпаведнасці з сэнсавымі часткамі, вызначанымі настаўнікам. Тэкст мэтазгодна падзяліць на больш дробныя часткі, каб вучням было лягчэй з імі працаваць, але пры гэтым варта ўлічваць, што сэнс частак не павінен разбураць логіку аўтарскіх разважанняў, бо наступны этап працы з тэкстам — гэта аналіз такога тыпу маўлення, як разважанне. Сістэматызаваць матэрыял на гэтым этапе дапаможа наступная табліца.

| Нумар часткі | Апорныя выразы | Тэзісы |
|---|---|---|

**Сэнсавыя часткі:** а) «Роднае слова! <...> раз спазналі...»; б) «Чаму ж <...> так робяць»; в) «Бедны той <...> самотны і пакінуты»; г) «Але поруч з любоўю <...> як на чужынца»; д) «Да нашай моладзі <...> чужое імя»; е) «Быў у нас пясняр <...> і на яе»; ё) «На вас, моладзі <...> ясных зор шчасця народнага».

Вызначэнне ў вылучаных частках *апорных выразаў* (утваральнікаў дзеяння і іх учынкаў) для разумення сэнсу: а) у адносінах да роднага слова — «чуем мы», «ты нам тлумачыш», «табе [мы. — *А. М.*] выказваем», «пераносіш ты нас у родны край»; б) людзі «часта забываюць», «лёгка адракаюцца» ад роднага слова: «тыя, хто выйшаў у людзі», «забываюць, адракаюцца» ўсяго роднага, «пераймаюць чужое»; «вясковая моладзь» «цураецца» мовы, на роднае «глядзіць чужымі вачыма»; в) той, хто «не мае скарбаў душы, бедны»; скарбы душы: «любоў да Бацькаўшчыны, народа, мовы»; яны «саграваюць» душу чалавека, які «ніколі не будзе адзін»; г) «злучае людзей родная мова»; але той, хто «адрокся мовы бацькоў сваіх», чужы сярод сваіх; д) «мы звяртаемся», «часта насміхацца», вы «пачынаеце саромецца», «разрываецца сувязь», «прымаеце» чужое; е) «пясняр клікаў беларусаў, каб шанавалі», «вокліч збудзіў прыспаныя сэрцы», «родная мова паднялася высока»; ё) «вялікая павіннасць: развіваць родную мову», «мейце смеласць усюды голасна казаць па-свойму».

**Тэзісы:** а) роля роднага слова ў жыцці чалавека ад маленства да сталасці; б) прычыны лёгкага адракання ад «роднага слова» і вызначэнне тых, хто цураецца роднага і таго, да чаго яны імкнуцца; в) супастаўленне душэўнай беднасці тых, хто «не мае вечных скарбаў душы», і тых, хто захоўвае гэтыя «скарбы»; г) роля роднай мовы ў яднанні людзей; д) вызначэнне тых, да каго звяртаецца пісьменніца, — моладзь; е) узор пераймання для тагачаснай моладзі; ё) абавязак моладзі ў адносінах да роднай мовы.

**III.** Паглыбленне паняцця пра такі тып маўлення, як разважанне (форма працы — гутарка):

- *форма артыкула* — зварот-прамова пісьменніцы ў выглядзе разважання (варта

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

звярнуць увагу вучняў на тое, што разважанне мае на мэце тлумачэнне чагосьці, доказ альбо аспрэчванне нейкай думкі ці высновы; разважанне найбольш пашырана ў навуковых тэкстах, у публіцыстыцы — гэтым настаўнік наладзіць сувязь з тэмай раздзела, у якім вывучаецца дадзены артыкул);

• *прыкметы звароту*: у пачатку артыкула Цётка непасрэдна звяртаецца да роднага слова, затым да моладзі; сябе і сваіх аднадумцаў аўтар называе «мы», прамаўляе ад імя гэтага «мы»;

• *прыкметы разважання*: спачатку пісьменніца прыводзіць назіранні, факты, меркаванні, сведчанні, лагічныя довады (яны ўжо вылучаны раней вучнямі пад кіраўніцтвам настаўніка і зафіксаваны ў табліцы), а потым агучвае галоўны вывад, заклік яе прамовы;

• выразная прыкмета гэтага разважання — яго эмацыянальнасць (клічныя і пытальныя сказы, якія напоўнены болем душы пісьменніцы з-за таго, што моладзь выракаецца роднай мовы; тут варта выразна і эмацыянальна падкрэслена прачытаць гэтыя сказы).

**IV.** Адрозненні публіцыстычных твораў ад твораў мастацкай літаратуры адносна паказу жыцця, а таксама падабенства публіцыстыкі і мастацкай літаратуры:

• адсутнасць у гэтым тэксце выдуманага аўтарам літаратурнага героя (-яў);

• адсутнасць сюжэта, завязкі, развіцця дзеяння, канфлікту, яго развязкі;

• у той жа час разважанні, якім уласціва эмацыянальнасць, могуць выкарыстоўвацца і ў мастацкай літаратуры: у думках, спрэчках, гутарках, сведчаннях літаратурных герояў (пры гэтым мэтазгодна прывесці наступны прыклад — урывак з апавядання Якуба Коласа «Думкі ў дарозе», якое раней разглядалася ў VII класе: «І куды ты нясеш мяне, няведамая дарога? <...> Як добра ў ціхую ночку!»);

• правесці падагульненні па гэтым пытанні настаўніку дапамогуць наступныя высновы. Адна з галоўных грамадскіх праблем пачатку XX ст., якая адлюстравана ў артыкуле, служыць нагодай для вострай сацыяльнай крытыкі, прысуду і заклiку, — усё гэта набліжае дадзены тэкст да публіцыстыкі. Мэта прамовы — актыўна ўздзейнічаць на сучаснікаў, на абуджэнне іх годнасці, нацыянальнай самасвядомасці. Гэтаму спрыяюць эмацыянальнасць і адпаведныя інтанацыі. Прадмет адлюстравання тут — супярэчлівыя праявы тагачаснага жыцця, якія выступаюць як аргументы, доказы, як нагода для сацыяльнага абвінавачвання, прысуду і заклiку.

З гэтага артыкула яскрава паўстае вобраз аўтара-прамоўцы, які звяртаецца да моладзі як старэйшы мудры дарадца. Гэты вобраз надзелены неспакойным характарам, катэгарычнасцю і ў той жа час разважлівасцю ў сведчаннях і высновах. Прамоўца жыве ў час агучвання яго парады, гаворыць усхвалявана і вобразна. А гэта ўжо прыкметы мастацкасці ў літаратурным тэксце.

**V.** Падагульненні і вывады па ўроку.

**VI.** Дамашняе заданне. Пазнаёміцца з урыўкам з нарыса У. Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі» («Вёска, о родная вёска мая!», с. 227—232).

* * *

Спадзяёмся, што матэрыял гэтага артыкула будзе спрыяць фарміраванню ў вучняў уменняў характарыстыкі публіцыстычнага тэксту, паступоваму назапашванню неабходных ведаў для будучага вывучэння публіцыстыкі ў IX класе.

Акрамя гэтага, прапанаваныя тут формы працы з артыкулам Цёткі накіраваны на раскрыццё агульных прыкмет публіцыстыкі, вылучэнне агульнага і адрознага паміж ёй і мастацкай літаратурай, выхаванне ў сямікласнікаў павагі да мовы беларускага народа, пачуцця грамадзянскай адказнасці за яе лёс.

## Спіс літаратуры

1. Беларуская дзіцячая літаратура : вучэб. дапам. / А. М. Макарэвіч [і інш.] ; пад агул. рэд. А. М. Макарэвіча, М. Б. Яфімавай. — Мінск : Вышэйш. шк., 2008. — 688 с.

2. Вучэбная праграма для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Беларуская літаратура: V—XI класы. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2010. — 128 с.

3. *Лазарук, М. А.* Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 7-га кл. агульнаадукац. устаноў з белару́с. і рус. мовамі навучання / М. А. Лазарук, Т. У. Логінава. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2010. — 304 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова